

# КОШУР Святлана Андрэеўна

СВЯТЛАНА КОШУР нарадзілася ў 1958 годзе ў вёсцы Валеўка Навагрудскага раёна. Скончыла Карэліцкую СШ (1974), Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1979). Працавала настаўніцай у навучальных установах Карэліцкага раёна. А на працягу 25 гадоў — у Карэліцкім раённым краязнаўчым музеі. Спярша працавала навуковым супрацоўнікам Карэліцкага раённага краязнаўчага музея, а ў 1996 годзе заняла пасаду старшага навуковага супрацоўніка. З гэтага часу краязнаўства стала выразным складнікам жыцця Святланы Кошур.

У беларускіх перыядычных выданнях і навуковых зборніках пачалі рэгулярна з'яўляцца краязнаўчыя артыкулы і нарысы карэліцкай даследчыцы. Каля 300 публікацый пабачылі свет на старонках газет «Культура», «Звязда», «Советская Белоруссия», «Літаратура і мастацтва», «Голас Радзімы», «Рэспубліка», «Краязнаўчая газета», у бюлетэні Скарынаўскага навукова-асветніцкага цэнтра «Кантакты і дыялогі», у розных навуковых зборніках. Гэта былі вынікі карпатлівай пошукавай працы, сустрэч з многімі людзьмі, работы ў архівах і Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Краязнаўцу ўдалося аднавіць біяграфіі многіх дзеячаў культуры і навукі, якія былі незаслужана забытыя альбо малавядомыя.

За чвэрць стагоддзя арганізавала ў музеі шмат выставак, прысвечаных гісторыі раёна і славутым землякам, правяла нямала творчых сустрэч з пісьменнікамі, вучонымі, артыстамі, мастакамі. Гэтаму папярэднічала вялікая і напружаная праца над стварэннем у музеі новай экспазіцыі «Зямля і людзі», якая была адкрыта ў 1995 годзе.

Аўтар каля 300 публікацый у кнігах, навуковых зборніках і перыядычных выданнях («Кантакты і дыялогі», «Літаратура і мастацтва», «Культура», «Советская Белоруссия», «Рэспубліка», «Краязнаўчая газета», «Голас Радзімы», «Гродзенская праўда»).

Напісала асобныя раздзелы і артыкулы для гісторыка-дакументальнай хронікі Карэліцкага раёна «Памяць» (2000).










Святлана Андрэеўна выдала дзевяць кніг краязнаўчай тэматыкі, сярод іх – «Вяртанне на Радзіму» (2002); «Зямля карэліцкая і яе славутыя людзі» (2009); «Лебядзіная песня Валянціна Рамановіча» (2011); «Залатая падкова Свіцязі» (2016); «Край запаветных мрояў» (2020). Кнігі Святланы Кошур захоўваюцца ў бібліятэках Беларусі і замежных краін.






У 2002 годзе стала лаўрэатам прэміі імя А. І. Дубко «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва» ў намінацыі «Музейны работнік года». У 2008 годзе атрымала Падзяку дырэкцыі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У 2012 год Святлану Андрэеўну прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. За кнігу «Залатая падкова Свіцязі», выдадзеную ў 2016 годзе, Святлана Кошур была другі раз узнагароджана прэміяй імя А. І. Дубко — у намінацыі «Пісьменнік года».

## «Когда звучит во мне мелодия стиха»

***

Когда звучит во мне мелодия стиха,
Ложатся на листок ряды негромких слов.
Пускай моя строка нетвёрда и тиха –
Все реки родились из маленьких ручьёв.

Мечту мою и боль в поток большой реки
Неси, струя! Слова живительно журчат.
И будет петь струна восторженной строки,
Пока звенит во мне мелодия ручья.

***

А слава быстротечна и капризна
И мимолётна, словно взмах крыла.
Глядишь – кивает кто-то с укоризной:
Взлететь хотела – крылья обожгла.

Но я за тех, кто устали не зная,
Кто, разбивая лица, руки в кровь,
Парит душой, над буднями взлетая,
И, падая, взмывает вновь и вновь.

***

Подари мне улыбку прежнюю,
Чтоб из сердца ушла тоска.
Подари мне улыбку нежную,
От которой стучит в висках.

Повтори те слова заветные,
Что шептал мне в ночи не раз.
Повтори те слова бессмертные,
От которых – слёзы из глаз.

Преврати меня снова в прежнюю,
В ту, что любит, любима сама.
Подари мне улыбку нежную,
От которой сойду с ума.